**Шпак, Н.** Воін-інтэрнацыяналіст / Н. Шпак // Ленінская іскра (Сянно). — 1989. — 24 чэрв. — С. 3.

## ВОІН- ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТ

Служба ў Афганістане для нашага земляка Уладзіміра Гарнака скончылася 11 лютага 1989 года. Разам са сваімі баявымі таварышамі ён пакінуў параненую снарадамі зямлю. Афганістан для многіх і многіх нашых воінаў стаў сапраўднай школай мужнасці і загартоўкі. У надзвычай цяжкіх умовах салдаты бачылі, хто на што здольны.

За баявыя заслугі Уладзімір Гарнак узнагароджаны юбілейным медалём «70 гадоў Узброеных Сіл СССР» і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага Афганскага народа».

Вярнуўшыся з Афганістана Уладзімір працягваў службу ў радах Савецкай Арміі, а ў маі гэтага года дэмабілізаваўся. Пасля службы ён атрымаў водпуск. Калі райком камсамола разам з райваенкаматам прапанавалі Уладзіміру папрацаваць у абаронча-спартыўным лагеры, які быў створаны на базе Машчонскай сярэдняй школы, то хлопец адразу ж згадзіўся. Быў Уладзімір у лагеры намеснікам камандзіра ўзвода. З ранку да вечара з юнакамі ён праводзіў заняткі па ваеннай і фізічнай падрыхтоўцы.

У лагеры Уладзімір служыў прыкладам для рабят. Яму шмат удавалася. Заўсёды на належным узроўні была дысцыпліна, ды і самі заняткі ён праводзіў як і належыць па армейскіх законах. Словам, рабяты прайшлі курс практычнай пачатковай падрыхтоўкі да службы ва Узброеных Сілах СССР. Шмат карыснага пачарпнулі юнакі ў свайго камандзіра, – зазначыў другі сакратар РК ЛКСМБ Юрый Квінто.

**Н. Шпак**